9. О мерах по дальнейшему развитию коллективного садоводства и огородничества [Электронный ресурс]: постановление Совета Министров СССР, 15 мая 1986 г., № 562 // Сейчас.ру. – Режим доступа: https://www.lawmix.ru/docs_cccp/1775. – Дата доступа: 09.02.2018.
10. Об индивидуальном строительстве дач [Электронный ресурс]: постановление Совета Министров СССР, 30 декабря 1960 г., № 1346 // Библиотека нормативно-правовых актов Союза Советских Социалистических Республик. – Режим доступа: http://libussr.ru/doc_ussr/usr_5639.htm. – Дата доступа: 09.02.2018.
11. О развертывании индивидуального рабочего огородничества [Электронный ресурс]: постановление Совета народных комиссаров СССР, 25 декабря 1933 г., № 2758 // Исторические материалы. – Режим доступа: http://istmat.info/node/39198. – Дата доступа: 09.02.2018.
12. Об улучшении жилищных условий генералов и офицеров Красной Армии [Электронный ресурс]: постановление Совета Министров СССР, 21 июня 1945 г., № 1466 // Библиотека нормативно-правовых актов Союза Советских Социалистических Республик. – Режим доступа: http://www.libussr.ru/doc_ussr/ussr_ 4544.htm. – Дата доступа: 09.02.2018.
13. Об упорядочении организации коллективного садоводства и огородничества [Электронный ресурс]: постановление Совета Министров СССР, 29 декабря 1984 г., № 1286 // Библиотека нормативно-правовых актов Союза Советских Социалистических Республик. – Режим доступа: http://libussr.ru/doc_ussr/usr_12465.htm. – Дата доступа: 09.02.2018.
14. Подсобное хозяйство предприятия. Садоводческое товарищество: сб. ст. / сост. А. С. Давыдов, Г. И. Тарасов. – М.: Профиздат, 1987. – 125 с.
15. *Бутовецкий, А. И.* Правовое положение садоводческих, огороднических и дачных некоммерческих объединений граждан: автореф. дис. … канд. юрид. наук: 12.00.03 / А. И. Бутовецкий. – Москва, 2010. – 31 с.
16. *Советин, Н. И.* Индивидуальное рабочее огородничество и задачи, стоящие перед ним в 1936 году / Н. И. Советин. – 1936 г. – 20 с.

**(Дата падачы: 28.02.2018 г.)**

*В. Э. Лук'янчук*
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск
*V. Lukyanchuk*
National Institute for Higher Education, Minsk

**УДК 94(476)**

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ РАМЕСНАЙ І ДРОБНАТАВАРНАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

# HISTORIOGRAPHY OF CRAFT AND SMALL-SCALE PRODUCTION OF BELARUS IN THE SECOND PART OF XIX – THE BEGINNING OF THE XX CENTURY

*Падаецца аналіз стану распрацаванасці і вызначаны перспектывы вывучэння гісторыкамі рамеснай і дробнатаварнай вытворчасці Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Адзначаецца адлюстраванне даследчыкамі зменаў у характары рамеснай і дробнатаварнай вытворчасці ў другой палове XIX – пачатку XX ст.: далейшы рост рамеснай вытворчасці стрымліваў развіццё буржуазных адносін у Беларусі, а працэс пе-*

*перарастання рамесных прадпрыемстваў у дробнакапіталістычныя станоўча ўплываў на развіццё капіталізму ў прамысловасці Беларусі.*
*Ключавыя словы: рамесная і дробнатаварная вытворчасць; капіталізм; генезіс; буржуазныя адносіны*

*The presented analysis of the exploration degree and the defined prospects for historical studies of the issue concern craft and small-scale production in Belarus in the second half of the XIX – the beginning of the XX centuries. An outline of the changes in the nature of craftsmanship and small-scale production reflected by the researches is defined in the following aspects: the further growth of craft production hampered the development of bourgeois relations in Belarus, whereas the process of transformation and development of craft enterprises into small private factories influenced positively the development of capitalism in Belarusian industry.*
*Key words: craft and small-scale production; capitalism; the genesis; bourgeois relations*

Да сённяшняга часу развіццё рамеснай і дробнатаварнай вытворчасці ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. не стала аб'ектам для напісання комплекснай самастойнай работы. Праблеме былі прысвечаны асобныя главы, раздзелы даследаванняў З. Е. Абезгауза, Д. А. Дудкова, М. Ф. Болбаса, А. М. Лютага, А. Э. Лютай, Л. Э. Пракаповіч. Цікавасць даследчыкаў у асноўным выклікаў характар рамеснай вытворчасці ў другой палове XIX ст., колькасныя паказчыкі асяроддзя рамеснікаў, тэмпы росту, сума вытворчасці і г. д.

У Энцыклапедыі гісторыі Беларусі рамяству даецца наступнае азначэнне: «Вытворчасць, заснаваная на індывідуальнай ручной працы з выкарыстаннем механічных прылад і інструментаў» [1, с. 95]. Майстэрні рамеснікаў былі невялікімі: на іх працавалі самі майстры, а таксама ў некаторых выпадках 2–3 наёмныя рабочыя. У сваім развіцці рамяство прайшло тры гістарычныя стадыі: хатняе рамяство, рамяство на заказ і рамяство на рынак, ці дробная таварная вытворчасць. Апошняя ва ўмовах развіцця грашовых адносін паступова перарастае ў дробнакапіталістычныя прадпрыемствы, на якіх працавала ад 5 да 15 рабочых без выкарыстання паравога рухавіка, вадзяныя і ветраныя млыны, пільні і алейні (да 10 рабочых), вінакурні і піваварні з вытворчасцю да 25 тысяч вёдзер, іншыя прадпрыемствы, на якіх выраблялася прадукцыі менш чым на 1 тысячу рублёў у год [2, с. 96].

Для гістарыяграфіі 60–90-х гг. XIX ст. было характэрна імкненне перабольшваць тэмпы развіцця капіталізму ў прамысловасці. Даследаванні П. О. Баброўскага, А. С. Дэмбавецкага прысвечаны асобным рэгіёнам Беларусі, багатыя на фактычны матэрыял, але носяць больш апісальны характар [3; 4].

У марксісцкай гістарыяграфіі галоўная роля ў сацыяльна-эканамічных працэсах адводзілася гандлёваму капіталу. К. Маркс і Ф. Энгельс звязвалі пачатак капіталістычных адносін у Расіі з рэформай 1861 г., аднак не адмаўлялі, што парасткі капіталізму з'явіліся раней, яшчэ ў эпоху феадалізму. Перадумовай для «пераўтварэння цэхавога і сельскага хатняга рамяства і феадальнага землеўладання ў капіталістычную вытворчасць» даследчыкі называлі гандаль [5, с. 370]. Менавіта гандаль, на іх думку, спрыяў развіццю прадукта ў тавар, для якога ствараў рынак, забяспечваў новай сыравінай і дадатковым абсталяваннем.

Умовай для развіцця капіталістычнага спосабу вытворчасці, паводле К. Маркса, з'яўляецца наяўнасць капіталу ў купцоў («для канцэнтрацыі грашовай маёмасці, а таксама таму, што капіталістычны спосаб вытворчасці прадугледжвае вытворчасць для гандлю, збыту ў буйных памерах і не асобным спажыўцам…») [5, с. 359]. Так, даследчык указвае на адну з прычын павольнага тэмпу развіцця буржуазных адносін у прамысловасці Беларусі – адсутнасць значных капіталаў у купецтва. Гэты фактар захоўваў умовы для далейшага развіцця рамяства ў другой палове XIX ст.

У манаграфічным даследаванні «Развіццё капіталізму ў Расіі» У. І. Ленін з марксісцкіх пазіцый даў характарыстыку трох асноўных стадый развіцця капіталізму ў рускай прамысловасці: простай капіталістычнай кааперацыі, капіталістычнай мануфактуры і фабрыкі. У. І. Ленін называе рамяство «першай формай прамысловасці, якая адрываецца ад патрыярхальнага земляробства, гэта значыць з'яўляецца вытворчасцю вырабаў па заказу спажыўца» [6, с. 329]. Аднак у гэтай форме прамысловасці яшчэ няма таварнай вытворчасці. Рамеснік пераўтвараецца ў таваравытворцу пры ўмове сутыкнення з рынкам, а «далейшае развіццё таварнай гаспадаркі выяўляецца ў пашырэнні гандлю, з'яўленні спецыялістаў-скупшчыкаў; рынкам для збыту вырабаў становіцца не дробны сельскі базар ці кірмаш, а цэлая вобласць, затым уся краіна, а часам нават і іншыя краіны» [6, с. 331–332].

Разгляд гісторыі прамысловасці ён пачынае з простай таварнай вытворчасці. На падставе аналізу вытворчасці Маскоўскай губерніі У. І. Ленін робіць вывады аб тэндэнцыях развіцця дробнатаварнай вытворчасці, якія сведчаць аб развіцці капіталістычных адносін:

- павелічэнне колькасці наёмных рабочых;
- узбуйненне прадпрыемстваў;
- павелічэнне сумы вытворчасці;
- утварэнне капіталістычных майстэрняў [6, с. 346].

«Распаўсюджванне дробных прадпрыемстваў… пашырае таварную гаспадарку, падрыхтоўвае глебу капіталізму (тым самым стварае дробных гаспадарчыкаў і наёмных рабочых), а паглынанне дробных прадпрыемстваў мануфактурай і фабрыкай ёсць утылізацыя буйным капіталам гэтай падрыхтаванай глебай» [6, с. 344–345].

Беларускія гісторыкі 20–30-х гг. XX ст. больш увагі надавалі аграрнай гісторыі. М. В. Доўнар-Запольскі ў працы «Народное хозяйство Белоруссии 1861–1914 гг.» адзначае, што 1860–1880-я гг. былі часам, калі адчуваўся значны ўплыў перажыткаў прыгонніцкай эпохі; пераход ад феадалізму да капіталізму адносіў толькі да сяр. 1890-х гг. [7, с. 233]. Рамяство і дробнатаварную вытворчасць гісторык аб'ектыўна называў пануючай формай прамысловасці ў другой палове XIX ст. Працэс капіталізацыі рамяства аўтар звязваў з «замяшчэннем работы на заказ работай на магазіны», якія ахоплівалі не толькі мясцовыя, але і, дзякуючы развіццю шляхоў зносін, больш далёкія рынкі [7, с. 163]. Звяртаючыся да канцэпцыі гандлёвага

капіталізму, аўтар апісвае паступовы працэс страты самастойнасці рамяства і рамеснікаў, якія пападаюць у залежнаць ад больш буйных прамыслоўцаў.

Д. А. Дудкоў у працы «Аб развіцці капіталізму ў Беларусі ў другой палове XIX і пачатку XX стст.» робіць спробу не толькі вызначыць умовы развіцця прамысловасці на беларускіх землях у другой палове XIX ст. (існаванне прыгонніцкіх перажыткаў, «нацыянальна-каланіяльная палітыка самадзяржаўя», выкарыстанне тэрыторыі Беларусі як рынку збыту расійскіх прамысловых тавараў і інш.), але і асаблівасці развіцця прамысловасці беларускіх земляў у складзе Расійскай імперыі. Да апошніх аўтар адносіць аграрны характар гаспадарання, нізкі ўзровень развіцця прамысловасці ў гарадах, пераважнае развіццё лёгкай прамысловасці, амаль адсутнасць саматужных сялянскіх промыслаў. Даследчык правільна дае ацэнку палітыцы царызму на беларускіх землях, падкрэсліваючы, што яна абмяжоўвала развіццё мясцовай прамысловай і сельскагаспадарчай буржуазіі, садзейнічала захаванню памешчыцкага землеўладання для абароны інтарэсаў памешчыкаў і буржуазіі цэнтральных раёнаў Расіі, тым самым «перашкаджала развіццю капіталізму ў Беларусі, затрымлівала распад прыгонніцкіх перажыткаў» [8, с. 92–94].

Памылкова адносіць Д. А. Дудкоў марксісцкі падыход аб паступовай страце «самастойнасці рамяства» і перарастанні спачатку ў капіталістычную мануфактуру, а затым фабрычна-заводскую вытворчасць да тэрыторыі Беларусі [8, с. 97]. Сучаснымі даследчыкамі А. М. Лютым, А. Э. Лютай на падставе архіўных матэрыялаў даказана, што на Беларусі прадпрыемствы названых тыпаў узнікалі паралельна з рамесніцкімі і ўтвараліся купцамі, якія мелі неабходны для гэтага капітал [9, с. 143].

Асобную ўвагу аўтар надае становішчу яўрэйскай буржуазіі. Д. А. Дудкоў пералічвае абмежаванні ў дзейнасці яўрэяў: забарона валодаць бровaрамі, арандаваць іх, прадаваць гарэлку (да 1863 г.); яўрэі-лесапрамыслоўцы былі пазбаўлены права карыстацца рускімі гаванямі і дадаткова плацілі грошы рабочым за выцягванне лесу на бераг; ім было забаронена будаваць лесапільныя прадпрыемствы па-за мяжой гарадоў і мястэчак; не мелі права яўрэі займацца гандлем у такіх партах, як Лібава, Рэвель, Віндава, Пецярбург і інш. [8, с. 93]. Неабходна пагадзіцца з Д. А. Дудковым, што ўсе гэтыя абмежаванні не толькі стрымлівалі развіццё гандлю, але і не дазвалялі яўрэйскай буржуазіі прымаць належны ўдзел у прамысловым развіцці краю, а значыць, і стрымлівалі працэс фарміравання класаў індустрыяльнага грамадства.

У другой палове XX ст. увага беларускіх гісторыкаў зноў вяртаецца да праблем гісторыі прамысловасці. У працы «Развитие промышленности и формирование пролетариата Белоруссии во второй половине XIX века» З. Е. Абезгауз адзначае станоўчыя тэндэнцыі ў павелічэнні колькасці рамеснікаў у другой палове XIX ст., прычыны чаго бачыць у павелічэнні насельніцтва гарадоў і мястэчак, што выклікала дадатковы попыт на рамесніцкія вырабы [10, с. 21]. Звяртае ўвагу на тэндэнцыю павелічэння колькасці рамеснікаў у мястэчках Беларусі ў параўнанні з гарадамі (у 1898 г.

66,3 % рамеснікаў працавалі ў мястэчках) [10, с. 22]. Слушнай з’яўляецца заўвага гісторыка, што рамяство ў другой палове XIX ст. адаптуецца да ўмоў суіснавання побач з фабрычна-заводскай прамысловасцю, у шматлікіх выпадках пачынае выпускаць тавары, якія ў якасці дадатковых запатрабаваны буйной прамысловасцю.

Аўтар спрабуе паказаць дынаміку росту колькасці рамеснікаў, сумы раменай вытворчасці Беларусі ў вызначаны перыяд. Аднак дадзеныя па асобных губернях, уездах і гарадах часам выкарыстоўваюцца аўтарам для падліку агульных паказчыкаў развіцця рамеснай і дробнатаварнай вытворчасці, а таму не могуць лічыцца аб’ектыўнымі і патрабуюць удакладнення.

Велізарная работа з колькасным матэрыялам была праведзена М. Ф. Болбасам пры падрыхтоўцы манаграфій «Развіццё прамысловасці ў Беларусі (1795–1861 гг.)» і «Прамысловасць Беларусі (1860–1900)». Як эканаміст даследчык дасканала працуе з лічбамі, зводзіць звесткі па паветах, губернях, галінах вытворчасці, групіруе іх па гадах у табліцы, імкнецца паказаць даныя ў дынаміцы. Аднак, жадаючы ахапіць адразу шырокі спектр пытанняў, не робячы спасылкі на крыніцы інфармацыі, часам робіць супрацьлеглыя вывады. Так, калі ў першай манаграфіі М. Ф. Болбас дакладна сцвяджае, што «прамысловасць Беларусі ў 1860 г. не дасягнула агульнарасійскага ўзроўню», то ў другой манаграфіі павялічвае дадзеныя па колькасці рабочых у 4,5 раза, а па суме вытворчасці – у 2,2 раза [11, с. 204; 12, с. 93]. Даследчыкамі А. М. Лютым, А. Э. Лютай на падставе архіўных дадзеных даказана, што сапраўды беларускія губерні ў 1861 г. па колькасці рабочых былі: Гродзенская – на 30-ым месцы, Магілёўская – на 33-ым, Віленская – на 40-ым, Мінская – на 44-ым, Віцебская – на 48-ым месцы з 66 губерній. Па суме вытворчасці адпаведна на 28-ым, 40-ым, 45-ым, 48-ым, 49-ым месцах [13, с.74].

Звяртае на сябе ўвагу, што М. Ф. Болбас першым з беларускіх гісторыкаў вызначае адну з прычын працяглага перыяду перавагі дробных прадпрыемстваў над буйнымі ў прамысловасці Беларусі, што адмоўна ўплывала на фарміраванне індустрыяльнага грамадства – «слабое першапачатковае накапленне капіталу мясцовай, пераважна яўрэйскай, буржуазіяй» [12, с.132].

Пры фармуляванні вывадаў М. Ф. Болбас часта звяртаецца да высноў У. І. Леніна аб развіцці капіталізму ў другой палове XIX ст., пераносячы тым самым агульнарасійскія тэндэнцыі на беларускі рэгіён. Як і Д. А. Дудкоў, М. Ф. Болбас памылкова сцвярджае, што рэформа 1861 г. паскорыла пераход «ад адыходных і хатніх промыслаў да рамяства, дробных капіталістычных прадпрыемстваў, а ад іх – да мануфактуры» [12, с. 41]. Пры характарыстыцы нацыянальнага складу рамеснікаў М. Ф. Болбас робіць спасылку на дадзеныя Д. А. Дудкова, якія сам жа называе завышанымі [12, с. 57]. Так, без увагі даследчыка засталіся такія пытанні, як сацыяльны і нацыянальны склад рамеснікаў і дробнатаварных вытворцаў, фарміраванне ўнутранага рынку пад уплывам дробнатаварнай вытворчасці, сувязь з сельскай гаспадаркай і інш.

З пачатку 90-х гг. ХХ ст. пад кіраўніцтвам доктара гістарычных навук, прафесара А. М. Лютага аформілася Навукова-педагагічная школа вывучэння праблем капіталізму і ўрбанізацыі, фарміравання беларускай нацыі, якая працягвае сваю дзейнасць і сёння. Калектывам аўтараў (А. М. Люты, А. Э. Лютая, Л. Э. Пракаповіч, А. П. Жытко, П. А. Тупік, А. А. Башмакоў, К. А. Бруханчык) была выдадзена абагульняючая праца «Гісторыя Беларусі перыяду капіталізму», у якой асобная частка прысвечана «Прамысловасці. Гандлю. Крэдыту» [14].

Так, удзельнік школы А. Э. Лютая падкрэслівае, што калі да сяр. XIX ст. «рамяство было пераважна элементам феадальнага спосабу вытворчасці», то ў другой палове XIX ст. пачынаецца эвалюцыя дробнай таварнай вытворчасці ў капіталістычную [15, с. 22]. Даследчык заўважае, што «першыя капіталістычныя прадпрыемствы… як быццам знікалі ў агульнай ваге дробных рамесных майстэрняў», і акрэслівае задачу для даследчыкаў генезісу капіталізму: вылучыць першыя парасткі капіталізму, параўнаць розныя прадпрыемствы па меры іх набліжэння да капіталістычных» [13, с. 69].

У манаграфіі «Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX стагоддзя» А. М. Люты звяртае ўвагу на слабасць буржуазіі як класса на Беларусі, што асаблівасцю фарміравання буржуазіі на беларускіх землях з’яўляецца колькасная перавага «як гарадской, так і сельскай буржуазіі, звязанай з дробнай рамеснай вытворчасцю і рознічным гандлем», і што гэтая сацыяльная група павялічваецца і ў другой палове XIX ст. [16, с. 69].

Аналізуючы развіццё фабрычна-заводскай прамысловасці Беларусі ў XIX ст., Л. Э. Пракаповіч адзначае, што вынікам далейшага росту рамеснай вытворчасці, сумы вытворчасці і колькасці рамеснікаў у другой палове XIX ст. былі «нізкія тэмпы развіцця буржуазных адносін» [17, с. 4]. Аўтар устанаўлівае сувязь паміж спецыялізацыяй рамеснікаў з яе уплывам на фабрычна-заводскую вытворчасць: наяўнасць у горадзе, мястэчку ці сельскай мясцовасці рамеснікаў нейкай спецыяльнасці была адной з прычын стварэння там буйной прамысловасці той жа галіны [17, с. 60].

Л. М. Сямёнава прысвяціла працу развіццю рамяства ў г. Мінску ў другой палове XIX ст. Характарызуючы прамысловае развіццё гарадской вытворчасці ўсёй Беларусі, аўтар робіць выснову, што «рост колькасці рамеснікаў у XIX ст. – гэта сведчанне недастатковага развіцця фабрычна-заводскай прамысловасці» [18, с. 40]. Разам з тым, аўтар вызначае і станоўчыя рысы развіцця прамысловасці Беларусі ў парэформенны перыяд: «распаўсюджванне купецкага, мяшчанскага, сялянскага прадпрымальніцтва з выкарыстаннем наёмнай працы», рост колькасці дробных капіталістычных прадпрыемстваў, удасканаленне прыладаў працы, далейшая спецыялізацыя, пашырэнне ўнутранага і знешняга рынкаў [18, с. 42].

Такім чынам, на сённяшні дзень праблема месца і ролі рамеснай дробнатаварнай вытворчасці ў развіцці прамысловасці Беларусі другой паловы

XIX – пачатку XX ст. не стала прадметам спецыяльнага манаграфічнага даследавання. Сучаснымі даследчыкамі былі вызначаны асноўныя тэндэнцыі ў развіцці рамеснай вытворчасці: павелічэнне колькасці рамеснікаў і сумы іх вытворчасці, распад рамесных цэхаў, паступовы пераход ад рамеснай да дробнай капіталістычнай вытворчасці, павышэнне тэмпаў развіцця рамяства ў мястэчках, змены ў галіновай структуры рамеснай вытворчасці і інш. Без засяроджанай увагі даследчыкаў засталіся такія аспекты праблемы, як суадносіны гарадскога і сельскага рамяства, працэс перарастання рамяства ў дробную таварную і капіталістычную вытворчасць, сацыяльны і нацыянальны склад рамеснікаў, у работах даследчыкаў падаюцца розныя дадзеныя па колькаснаму складу рамеснікаў (на канец XIX ст. М. Матусевічам – 77,1 тыс., М. Ф. Болбасам – 111 тыс., З. Е. Абезгаузам – 150 тыс., Д. А. Дудковым – 200 тыс.).

Аналіз гістарыяграфіі рамеснай і дробнатаварнай вытворчасці ў другой палове XIX – пачатку XX ст. паказаў, што праблема цесна звязана з працэсам генезісу капіталізму на беларускіх землях. Калі ў дарэформенны час рамяство з'яўлялася элементам феадальнага спосабу вытворчасці, то ў другой палове XIX ст. далейшы рост сумы рамеснай вытворчасці, колькасці майстэрняў і рамеснікаў сведчыў аб захаванні прыгонніцкіх перажыткаў, нізкіх тэмпах развіцця буржуазных адносін на Беларусі. Змена характару рамяства ад «вытворчасці на заказ» да «вытворчасці на рынак» садзейнічала перарастанню рамяства ў дробнатаварную вытворчасць. Павелічэнне колькасці наёмных рабочых на прадпрыемствах, сумы дробнай капіталістычнай вытворчасці, пашырэнне вытворчасці сведчаць аб генезісе капіталізму ў прамысловасці Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 Т. Т. 6. Кн. 1: Пузаны – Усая / Беларуская энцыклапедыя; рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2001. – 591 с.

2. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч.2. XIX – XX стагоддзі: курс лекцый / рэдкал.: П. І. Брыгадзін [і інш.]. – Мінск: РІВШ БДУ, 2002. – 656 с.

3. Гродненская губерния: в 2 ч. (2 прил.) // Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. – СПб.: Тип. Деп. уделов, 1859–1868.

4. Опыт описания Могилевской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях / сост. [с предисл.] и под ред. А. С. Дембовецкого. – Могилев, 1882–1884. – Т. 3. – 1883 г. – 1000 с.

5. *Маркс, К.* Сочинения: в 30 т. / К. Маркс, Ф. Энгельс. – 2-е изд. – М.: Политиздат, 1961. – Т. 3. – Ч. 1. Кн. 3: Процесс капиталистического производства, взятый в целом / К. Маркс. – 1950. – 932 с.

6. *Ленин, В. И.* Полное собрание сочинений: в 50 т. / В. И. Ленин. – 5-е изд. – М.: Политиздат, 1979–1983. – Т. 3: Развитие капитализма в России. – 791 с.

7. *Довнар-Запольский, М. В.* Народное хозяйство Белоруссии 1861–1914 гг. / М. В. Довнар-Запольский. – Минск: Изд. Госплана БССР, 1926. – 240 с.

8. *Дудкоў, Д. А.* Аб развіцці капіталізму ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. / Д. А. Дудкоў. – Менск: Партмассэктар, 1932. – 202 с.

9. *Люты, А. М.* Рамесная і дробнатаварная вытворчасць у Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX ст. [Электронный ресурс] /А. М. Люты, А. Э. Лютая // Новая и новейшая история Европы и США: исследования, проблемы, поиски: сб. науч. ст. – Минск, 2007. – Режим доступа: http://elib.bspu.by/handle/doc/10468. – Дата доступа: 12.02.2018.

10. *Абезгауз, З. Е*. Развитие промышленности и формирование пролетариата Белоруссии во второй половине XIX века / З. Е. Абезгауз. – Минск: Наука и техника, 1971. – 179 с.

11. *Болбас, М. Ф*. Развитие промышленности в Белоруссии (1795–1861 гг.) / М. Ф. Болбас. – Минск: Наука и техника, 1966. – 268 с.

12. *Болбас, М. Ф.* Промышленность Белоруссии. 1860–1900 / М. Ф. Болбас. – Минск: Изд-во БГУ, 1978. – 312 с.

13. *Лютая, А. Э.* Роль и место ремесла в процессе генезиса капитализма в Беларуси во второй половине XVIII – первой половине XIX вв. – Минск, 2006. – 116 с.

14. *Люты, А. М.* Прамысловасць Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.: у 5 ч. / А. М. Люты, А. Э. Лютая, Л. Э. Пракаповіч // Гісторыя Беларусі перыяду капіталізму: вучэб.-метад. дапам. – Мінск, 2011. – Ч. 5. – 280 с.

15. *Лютая, А. Э.* Ремесло в Беларуси во второй половине XVIII – первой половине XIX вв. автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / А. Э. Лютая; БГПУ им. М. Танка. – Минск, 2003. – 27 с.

16. *Люты, А. М.* Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX стагоддзя: манаграфія / А. М. Люты. – Мінск, 2004. – 322 с.

17. *Пракапович, Л. Э.* Становление и развитие фабрично-заводской промышленности в Беларуси в XIX в. / Л. Э. Пракапович. – Минск: БГПУ, 2010. – 156 с.

18. *Семёнова, Л. Н.* Ремесленный Минск на исходе XIX ст. / Л. Н. Семенова. – Минск: БНТУ, 2015. – 230 с.

**(Дата падачы: 28.02.2018 г.)**

*А. А. Любая*
ДУА «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы», Мінск
*A. A. Lubaya*
National Institute for Higher Education, Minsk

**УДК 947.6**

# ТАТАРСКІ АДДЗЕЛ У СТРУКТУРЫ КАНЦЫЛЯРЫІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў XV–XVI СТСТ. (некалькі заўваг да пастаноўкі праблемы)

# THE TATAR DEPARTMENT IN THE STRUCTURE OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA CHANCELLERY IN THE XV–XVI CENTURY (some remarks on the problem)

*У артыкуле аўтар абгрунтоўвае тэзіс аб неабходнасці вывучэння дзейнасці татарскіх пісараў і талмачоў як гісторыі самастойнай адміністрацыйнай адзінкі ў складзе Канцылярыі Вялікага Княства Літоўскага. Звяртаецца ўвага на той факт, што адны і тыя ж асобы з татарскага асяроддзя рэгулярна, працяглы час узгадваюцца ў якасці пісараў і талмачоў як у дакументах справаводства, так і ў крыніцах дыпламатычнага характару. Больш за тое, захаванасць архіва арыгінальных актаў з Канцылярыі*